

ШТО АБ'ЯДНОЎВАЕ БЕЛАРУСАЎ

2

КАЛЯДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

4




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

6 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 3 (29883)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Сёння мы бачым, што за старэйшым пакаленнем стаіць вялікая гісторыя, гэта заслужаныя людзі, гэта людзі, якія маюць больш за паўвекавы стаж працоўнай дзейнасці, гэта ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Таму вельмі важна забяспечыць змену пакаленняў, каб мы і наша моладзь, прыходзячы і сустракаючыся з людзьмі сталага ўзросту, перанялі тыя каштоўнасці, ідэалы і традыцыі, на якіх выхоўвалася гэтае пакаленне. Сапраўды, падчас такіх сустрэч адбываецца ўзаемаўзбагачэнне: маладыя людзі дораць пажылым сваю энергію, цеплыню, жыццярадаснасць, з іншага боку, яны могуць запазычыць неабходную мудрасць і сталасць».*

# ДАКАЗВАЦЬ ВЕРУ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ

**Праваслаўным хрысціянам Беларусі**

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас са святам Раства Хрыстова.*

*У гэты цудоўны час, калі сэрцы мільёнаў вернікаў сагрэтыя чараўніцтвам аднаго з самых светлых хрысціянскіх свят, мы адчуваем адзінства з усім праваслаўным светам, напаўняемся асаблівым пачуццём датычнасці да вялікага таінства і даказваем сваю веру добрымі справамі.*

*Для беларусаў галоўныя хрысціянскія каштоўнасці — шчырая любоў да блізкага, мудрасць, адкрытасць, міласэрнасць — былі і застаюцца сапраўднай пуцяводнай зоркай. Ведаючы не па чутках цану міру і згодзе, дружбе і добрасуседству, мы заўсёды гатовыя працягнуць руку дапамогі ў цяжкай сітуацыі і падзяліць радасныя моманты.*

*Няхайззянне Раства азорыць шчасцем кожную сям'ю, умацуе дамашні ачаг, напоўніць яго непаўторнай атмасферай узаемаразумення і цяпла.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міхайлаўская царква ў Жодзіне.

## КОРАТКА

- Беларусы лічаць тэлебачанне асноўнай крыніцай атрымання інфармацыі аб гісторыі краіны.
- **У нашай краіне ў 2022 годзе адрамантавалі 800 км рэспубліканскіх і 1,5 тысячы км мясцовых дарог.**
- Беларусь нарошчвае чыгуначныя грузаперавозкі ў Кітай.
- **Дзяржстандарт аб'явіў конкурс на найлепшыя тавары 2022 года.**
- У Беларусі прадоўжана рэгуляванне цэн на будаўнічыя матэрыялы да 1 студзеня 2024 года.
- **Партыя новых БТР-82А прыбыла ў Беларусь.**
- У Беларусі для палявых работ у гэтым годзе задзейнічаюць 212 тысяч адзінак тэхнікі.
- **Мінабароны: працягваецца нарошчванне рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі.**

ISSN 1990 — 763X

Нябеснае і зямное

# Пад сузор'ем Малой Мядзведзіцы

### Круглянскія школьнікі прыходзяць у храм, каб паглядзець на зорнае неба

**Падлеткаў вабіць загадкавае мігаценне далёкіх зорак, якія яны разглядаюць праз аб'ектыў царкоўнага тэлескопа. У прыход круглянскага храма Святой Тройцы яны наведваюцца разам са сваёй настаўніцай фізікі Палінай Трыфанавай на занятці па астраноміі.**

Гэты прыход наогул руйнуе ўсе стэрэатыпы ва ўяўленні пра храмы ў глыбінцы. Часцей за ўсё думаюць, што ў невялікім населеным пункце і царква бедная, і паства нешматлікая. Але ў Круглым усё наадварот. Храм распісваюць вядомыя беларускія мастакі, насельніцтва актыўна наведвае духоўна-асветніцкі цэнтр, які тут функцыянуе, пры ім, дарэчы, і збіраюцца мясцовыя аматары астраноміі. Для невялікага Круглага, дзе, як жартуе **настаяцель храма протаіерэй Генадзь КАЖАНОЎСКІ**, у асноўным жылі адны атэісты, гэта дасягненне.

Але так было не заўсёды. Храм Святой Тройцы знаходзіцца на месцы, дзе ў пачатку XIX стагоддзя стаяў іншы — у гонар Святых бяссрэбранікаў Кіра і Іаана. Пабудаваны ён быў па загадзе сяброўкі і паплечніцы расійскай імператрыцы Кацярыны Вялікай і тутэйшай апякункі — княгіні Кацярыны Дашкавай. На жаль, ад былой царквы засталіся толькі ўспаміны, а цяперашняя пабудаваная ў кастрычніку 2005 года. З дапамогай тагачаснага кіраўніка ПМК-266 Мікалая Патрончыка, які ўжо пайшоў з жыцця, побач з храмам і з'явіўся духоўна-асветніцкі цэнтр, куды сёння дзеці бегаюць глядзець у тэлескоп. А вернікі з удзячнасцю ўспамінаюць Мікалая Васільевіча, які дапамог храму і з праектна-каштарыснай дакументацыяй, і з будаўнічым матэрыялам.

СТАР. 3



З першых вуснаў

# «ПАЛОВУ ТАГО, ШТО ВЫРАБЛЯЕМ, МЫ ПАВІННЫ БУДЗЕМ ПРАДАЦЬ, КАБ НАРМАЛЬНА ЖЫЦЬ»

**Пытанні экспарту беларускай прадукцыі абмеркавалі падчас нарады ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. На парадак дня таксама былі вынесены пытанні партовага супрацоўніцтва, стварэнне магутнасцяў для марскіх перавозак, лагістыка і геаграфія экспарту прадукцыі калійнай галіны.**

«Нам летась удалося пераадолець негатыўныя тэндэнцыі і выйсці ў грашовым выяўленні на дадатныя вынікі па экспарце. Вядома, грошы вырашаюць усё. Але хацелася б, каб мы паштучна павялічвалі экспарт», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паштучна — гэта значыць, што трактароў і аўтамабіляў, калійных угнаенняў і нафтапрадуктаў у тонах і штуках у мінулым годзе рэалізавана менш, чым у 2021-м.

«Трэба думаць аб тым, як нарошчваць экспарт. Экспарт — гэта валюта, без якой краіна і эканоміка жыць не могуць. Тым больш Беларусь экспартаарыентаваную эканоміку мае. Палову таго, што вырабляем, мы павінны будзем прадаць, каб нармальна жыць», — адзначыў Прэзідэнт.

У цэнтры ўвагі падчас нарады быў экспарт асноўных тавараў. Гэта і нафтапрадукты, і калійныя ўгнаенні і тэхніка — усё ж, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, аўтамабілебудаванне развіта прыстойна.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў мінулым годзе нас спрабавалі задушыць санкцыямі, натуральна, парушылася лагістыка. Прыйшлося шукаць новыя лагістычныя шляхі для продажу тавараў. Гэта таксама стала адной з тэм нарады. «Прынамсі, тое, што вы прасілі вырашыць мяне на ўзроўні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі для таго, каб былі адкрыты для нас парты, я мяркую, што ўсе пытанні вырашаны. Пытанне застаецца за малым — пачынаць грузіць у гэтых партах. Хоць сёе-тое мы ўжо пачалі грузіць. Трэба хутчэй будаваць гэтыя парты. Даводзіць да пэўнага ўзроўню і гандляваць ужо праз уласныя парты, а не праз чужую ўласнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў актывізавацца і паскарацца ў вырашэнні пытанняў, звязаных з рэалізацыяй беларускага экспарту.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ У тэму

**Мікалай СНАПКОЎ:**

## «БЕЛАРУСКІ ЭКСПАРТ ЗАБЯСПЕЧАНЫ ПАРТОВАЙ ІНФРАСТРУКТУРАЙ»

Пасля нарады ў Прэзідэнта віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў расказаў журналістам, як складваецца сітуацыя з беларускім экспартам і як яна будзе развівацца ў новым годзе.

Па яго словах, Беларусі ўдалося дасягнуць дасанкцыйных аб'ёмаў экспарту. У выніку сальда гандлёвага балансу склалася на гістарычна высокім узроўні 4,5 мільярда долараў. «Чатыры з паловай мільярда долараў — гэта гістарычная лічба, і яна вельмі важная, бо фарміруе стабільнасць на валютным рынку, забяспечанасць краіны залатавалютнымі рэзервамі. Фактычна яна фарміруе стабільнасць і спакой у фінансавай сферы краіны ў цэлым. У нас устойлівая сітуацыя ў валютным складніку нашай эканомікі. Усё гэта важна», — сказаў Мікалай Снапкоў.

Па яго словах, Прэзідэнт мае рацыю ў тым, што па аб'ёмах экспарту дасанкцыйны ўзровень не дасягнуты. Але толькі па некаторых пазіцыях, якія сёлета трэба падцягнуць, і для гэтага ёсць усе перспектывы.

Адказваючы на пытанне журналістаў, як далей будзе развівацца сітуацыя па экспарце калійных угнаенняў, Мікалай Снапкоў адказаў, што палітыка палітыкай, а бізнес бізнесам: «Угнаенне — гэта прадукты харчавання. Прадукты харчавання — гэта стабільнасць краін, якія куплялі нашы ўгнаенні. Традыцыйныя рынкі нашы ўгнаенні бяруць. Наўрад ці мы ў наступным годзе зможам пастаўляць угнаенні ў ЗША ці Еўрапейскі Саюз. Але, уласна кажучы, гэта не такія вялікія аб'ёмы, якія маглі б нам пагоршыць сітуацыю па аб'ёмах». Мікалай Снапкоў адзначыў, што плануецца асвоіць рынкі Афрыкі і асобных краін Лацінскай Амерыкі, раней пастаўкі на гэтыя рынкі ішлі праз трэйдараў. Адпаведныя напрацоўкі ўжо ёсць. Таму, па яго словах, у новым годзе нарастуць новыя рынкі і захаваюцца традыцыйныя. На традыцыйныя рынкі пастаўкі могуць нават павялічыцца.

«Павялічацца, таму што паменшыцца кошт. На жаль, мы назіралі летась, што з высокім ростам цаны зменшыліся аб'ёмы спажывання ў тым ліку калію на традыцыйных рынках. Сёння мы бачым зніжэнне кошту і, адпаведна, чакаем (і гэта пацвярджаецца ўжо перагаворамі), рост аб'ёму. Абыходзячы еўрапейскіх і амерыканскіх пасрэднікаў, выйдзем на рынкі Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. І адпаведна, мы чакаем, што выйдзем на прыкладна ўзровень аб'ёму 2021—2022 года», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Журналісты пацікавіліся, якія будуць дзеянні, калі прыбалтыйскія краіны прапануюць беларускім партнёрам зноў пастаўляць сваю прадукцыю праз свае парты. «Паглядзім на ўмовы, якія прапануюць нам, бо сёння нам ужо гэта не прынцыпова. Скажу шчыра, дзякуючы тытанічнай працы Прэзідэнта, мы ўжо змаглі не сапсаваць сітуацыю, і сёння мы забяспечваем партовай структурай увесь экспарт Рэспублікі Беларусь. На 80 працэнтаў гэта нафтапрадукты і калійныя ўгнаенні. У нас дастаткова сёння партовай інфраструктуры, каб вывозіць увесь аб'ём экспартаванага прадукту. Сёння партовая інфраструктура Расійскай Федэрацыі для нас выйшла на першы план. Мы гатовыя перавозіць усё і развіваць далей пры неабходнасці. Мы абмяркоўвалі сёння гэтае пытанне, і эканамічная катэгорыя зразумелая — эканамічная эфектыўнасць і эканамічная мэтазгоднасць развіцця партовай інфраструктуры. Тое, што сёння ў нас ёсць, што мы развіваем, нас задавальняе і па тарыфах, і па кошце», — сказаў Мікалай Снапкоў.

Грамадская думка

# БЕЛАРУСАЎ АБ'ЯДНОЎВАЕ ПРЫХІЛЬНАСЦЬ ДА КРАІНЫ І МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі падзяліўся вынікамі сацыялагічнага даследавання

**Яно праводзілася ў жніўні-верасні мінулага года і было прысвечана вывучэнню асаблівасцяў фарміравання патрыятычных каштоўнасцяў жыхароў Беларусі. Сацыялагічным даследаваннем былі ахоплены ўсе абласныя цэнтры і Мінск. Выбарачна — іншыя гарадскія і сельскія населеныя пункты ва ўсіх рэгіёнах краіны. У анкетным апытанні ўзялі ўдзел беларусы ва ўзросце ад 18 гадоў і вышэй. Усяго ў сацыялагічным даследаванні было задзейнічана 1848 рэспандэнтаў.**

Адно з пытанняў, на якое прапаноўвалася адказаць удзельнікам сацдаследавання, гучала так: «Што для вас значыць быць патрыётам Беларусі?» «48 % грамадзян адказала — жыць і працаваць у Беларусі, 37,6 % — быць гатовым у складаны час абараніць сваю краіну, 35,7 % — паважаць дзяржаўную сімволіку і гісторыю Беларусі, 35,2 % — любіць беларускую культуру і мову, 32,6 % — весці актыўную дзейнасць на карысць краіны», — паведаміў **дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Мікалай МЫСЛІВЕЦ**. Кандыдат сацыялагічных навук звярнуў увагу на тое, што 66,6 % рэспандэнтаў лічаць герб, гімн і сцяг галоўнымі нацыянальнымі сімваламі нашай краіны.

Адказваючы на пытанне «На вашу думку, хто (што) у большай ступені ўплывае на фарміраванне патрыятычных пачуццяў у насельніцтва?», 66,4 % рэспандэнтаў адзначыла, што гэта сям'я, 51,1 % — установы адукацыі, 38,5 % удзельнікаў апытання аддалі свой голас на карысць сродкаў масавай інфармацыі. «Мы пацікавіліся ў рэспандэнтаў, ці адчуваюць яны прыхільнасць да Беларусі ў цэлым, да месца свайго нараджэння, месца свайго цяперашняга пражывання, — заўважыў Мікалай Мыслівец. — Беларусь — агульны дом для ўсіх, незалежна ад нашага месца нараджэння. Прыхільнасць да краіны ў цэлым і да сваёй малой радзімы — тое, што аб'ядноўвае ўсіх нас».

Таксама ўдзельнікам анкетнага апытання прапаноўвалася адказаць, што для іх значыць быць грамадзянінам Беларусі. 45,2 % рэспандэнтаў паведаміла, што гэта мець беларускае грамадзянства, 44,4 % — мець грамадзянскія правы і свабоды, 42,3 % — выконваць законы сваёй краіны, 41,5 % — паважаць гісторыю Беларусі, 35,8 % — адчуваць адказнасць за лёс сваёй краіны, 29,3 % — паважаць дзяржаўную сімволіку, 26,9 % — адчуваць адзінства са сваім народам, 26,5 % — мець актыўную грамадзянскую пазіцыю. Не вызначылася з адказам 2,8 % з тых, хто ўдзельнічаў у апытанні.

Як звярнуў увагу Мікалай Мыслівец, вынікі гэтага даследавання і тых даследаванняў, якія Інстытут сацыялогіі праводзіў на працягу шэрагу папярэдніх гадоў, сведчаць аб узрастанні значнасці такіх сацыялізацыйных фактараў, як інстытуты права, прававая сацыялізацыя і прававая культура. «Як бачым пры адказе на пытанне, у першую чаргу падкрэсліваецца наяўнасць беларускага грамадзянства, грамадзянскіх правоў і свабод, захаванне законаў сваёй краіны, — заўважыў ён. — Такім чынам, прававы складнік працэсу фарміравання патрыятычных каштоўнасцяў набывае асаблівае, прынцыповае значэнне».

Найбольш актуальнымі кірункамі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Беларусі ўдзельнікі сацыялагічнага даследавання назвалі дзяржаўную падтрымку маладых сем'яў (49,7 %), садзейнічанне фарміраванню здаровага ладу жыцця моладзі (47,9 %), грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне моладзі (44,4 %). Пры адказе на пытанне аб найбольш знакавых дзяржаўных святах Беларусі рэспандэнты аддалі перавагу Дню Перамогі (81,7 %). На другім месцы — Дзень Незалежнасці, які назвалі найважнейшым святам 53,4 % рэспандэнтаў.

Што датычыцца перыядаў гісторыі Беларусі, то найбольш цікавымі, па меркаванні ўдзельнікаў сацдаследавання, з'яўляюцца Вялікая Айчынная вайна (44,7 %), эпоха Вялікага Княства Літоўскага (18,5 %), першыя дзесяцігоддзі XIX стагоддзя (16,1 %). Асноўнымі крыніцамі атрымання інфармацыі аб гісторыі Беларусі для рэспандэнтаў з'яўляюцца тэлебачанне (58,9 %), інтэрнэт-рэсурсы (44,7 %), кніжныя выданні (34,9 %).

**Веранiка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Столтэнберг: небяспечна недаацэньваць Расію

Генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг заявіў, што небяспечна недаацэньваць амбіцыі Расіі і яе прэзідэнта Уладзіміра Пуціна ў канфлікце ва Украіне. Аб гэтым ён паведаміў на дзелавой канферэнцыі ў Нарвегіі, перадае Reuters.

«У нас няма ніякіх прыкмет таго, што прэзідэнт Пуцін змяніў свае планы і мэты ва Украіне. Так што недаацэньваць Расію небяспечна», — сказаў генеральны сакратар альянсу. Столтэнберг заклікаў дзяржавы Захаду аказаць доўгатэрміновую падтрымку Украіне з-за баявых дзеянняў, якія працягваюцца. Паводле яго слоў, распачатая ў Расіі ў верасні мінулага года частковая мабілізацыя дэманструе, што расійскае кіраўніцтва не мае намеру спыняць канфлікт ва Украіне.

Да гэтага віцэ-спікер Савета Федэрацыі Канстанцін Касачоў заяўляў, што жаданне Украіны вярнуць страчаныя тэрыторыі стварае перспектыву ваеннага нападу НАТА на Расію, што будзе спыняцца ўсімі спосабамі.

### The Times: закон аб забастоўках прэм'ера Сунака дазволіць звальняць рабочых



Работадаўцы змогуць падаваць у суд на прафсаюзы і звальняць супрацоўнікаў у адпаведнасці з планамі ўрада Вялікабрытаніі па абмежаванні права на забастоўку, піша The Times.

Адзначаецца, што брытанскі прэм'ер-міністр Рышы Сунак падрыхтаваў закон аб забеспячэнні мінімальнага ўзроўню абслугоўвання ў шэрагу сектараў, уключаючы ахову здароўя, чыгуначны транспарт, адукацыю, пажарную і пагранічную бяспеку. Згодна з нанаўвядзеннем, частка работнікаў павінна працягваць працаваць і падчас забастовак, каб захаваць мінімальны ўзровень абслугоўвання.

Паводле крыніцы ва ўрадзе Вялікабрытаніі, якая ўдзельнічала ў абмеркаваннях закона, забастоўкі будуць лічыцца незаконнымі, калі прафсаюзы адмовяцца забяспечыць такі мінімальны ўзровень абслугоўвання: «У выніку людзей могуць звольніць».

### Вучоныя назвалі просты спосаб запаволіць старэнне

Даследчыкі з Нацыянальнага інстытута здароўя ЗША высветлілі, што высокі ўзровень натрыю з-за недастатковага спажывання вадкасці можа паскорыць старэнне. Гэтае даследаванне апублікавана ў часопісе eBioMedicine.

У вывучэнні прыняло ўдзел 11 тысяч чалавек у сярэднім і пажылым узросце. Іх біялагічны ўзрост разлічваўся на аснове 15 прыкмет, уключаючы артэрыяльны ціск, узровень халестэрыну і цукру ў крыві і іншыя паказчыкі.

Было выяўлена, што ўзровень натрыю, які перавышае 142 ммоль/л, на 39 % павялічваў магчымасць развіцця хранічных захворванняў. Акрамя таго, колькасць натрыю больш як 144 ммоль/л была звязана з павышанай на 21 % рызыкай ранняй смерці.

З дапамогай аналізу іншых публікацый аўтары пацвердзілі, што больш высокі ўзровень натрыю звязаны з меншым спажываннем вадкасці. Акрамя таго, ранейшыя даследаванні паказалі, што больш нізкая гідратацыя арганізма актывуе шляхі, якія паскараюць старэнне і дэгенератыўныя працэсы, а таксама скарачае працягласць жыцця.



# ПАСЛАННЕ ДА РАДЖАСТВА ХРЫСТОВАГА

## Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

**Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!**

Зноў мы з хваляваннем услухоўваемся ў ангельскія словы, якія абвяшчаюць пра найвялікшую падзею ў гісторыі чалавецтва: «Нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давідавым Спасіцель, Які ёсць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2, 11).

Кожны з нас сёння становіцца сведкам здзяйснення старажытных прароцтваў пра спасенне чалавека і разам са святым Грыгорыем Багасловам спасцігае таямніцу прышэсця ў свет Спасіцеля: «Бесцялесны ўцялесніваецца... Нябачны становіцца бачным, Недакранальны становіцца дакранальным, Пазачасавы атрымлівае пачатак. Сын Божы становіцца Сынам Чалавечым».

Любоў Бога да чалавецтва настолькі вялікая, што Ён не проста пасылаў да людзей пракрокаў і суддзяў, праз якіх навучаў запаведзям, а «...Сына Свайго Адзінароднага даў, каб кожны, хто верує ў Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае» (Ін. 3, 16). Таму нечуваныя раней у свеце словы, абвешчаныя апосталам Іаанам Багасловам: «Бог ёсць любоў», — гэта не плод багаслоўскіх разважанняў. Яны засведчаны Нараджэннем Спасіцеля, Яго зямным жыццём і грамадскім служэннем, Яго прапаведдзю і цудамі, смерцю на Крыжы і Уваскрасеннем.

Менавіта таму нашы сэрцы напоўнены сёння такой невымоўнай радасцю і духоўным лікаваннем. Сын Божы ўвайшоў у наш свет і на векі вечныя злучыў Сябе з чалавекам, стаўшы падобным да нас ва ўсім, акрамя граху, даючы радасць вечнага жыцця, паўнаты быцця з Богам: «Вызвалены быў звязаны Адам і свабода ўсім верным даравана, калі спавівалі Цябе, Спасіцель» (Канон перадсвята Раджжаства). І, паводле слова святціцеля Іларыёна Кіеўскага, больш не зацінута чалавецтва ў кайданах закону, «а ў Благадаці свабодна жыве».

«Слава ў вышніх Богу і на зямлі мір, у людзях добрая воля» (Лк. 2, 14), — вось ужо больш за дзве тысячы гадоў гэтыя словы ангелаў гучаць і як абяцанне, і як заклік: заклік стварэць Царства Нябеснае ў сваёй душы, захоўваць мір і любоў паміж людзьмі. Часам нам здаецца, нібыта ад нас мала што залежыць, нібыта ўсё ў нашай гісторыі вырашаецца «моцнымі свету гэтага». Але Гасподзь нарадзіўся не ў царскіх харомах, а ў простай пячоры, быў пакладзены ў яслі для жывёл і тым самым паказаў, што «Бог выбраў неразумнае свету, каб пасароміць мудрых» (1 Кар. 1, 27).

Клопаты пра хлеб надзённы, дабрабыт і грамадскае ўладкаванне — усё гэта, несумненна, важна і патрабуе нашага ўдзелу, пакуль мы жывём на зямлі. Але не ў гэтым сапраўдная аснова жыцця чалавека. Колькі б людзі ні спрабавалі вырашыць грамадскія супярэчнасці і пабудаваць гарманічнае грамадства, намаганні не прынясуць добрых пладоў, пакуль не будзе міру ў чалавечай душы.

А гэты мір дасягаецца барацьбой з грахом і няпраўдай у нашым сэрцы, здзяйсненнем добрых спраў і міласэрнасцю да блізкіх. Менавіта ў гэтым крыніца добрых перамен ва ўсіх сферах чалавечага быцця, і Гасподзь праз апостала заклікае нас: «А па-над усім гэтым апраніцеся ў любоў, якая з'яўляецца сукупнасцю дасканаласці» (Кал. 3, 14).

Таму такімі важнымі з'яўляюцца штодзённыя і пастаянныя добрыя справы, нават калі яны не здаюцца нам чымсьці значным і вялікім. З іх і складаецца тое, што прыцягвае міласць Божую на нашу зямлю, на наш народ і стварае трывалы падмурак для сямейнага, грамадскага і асабістага жыцця.

Памятаючы пра гэта, напоўнім наша жыццё ўдзячнасцю Богу, радасцю аб Яго вялікіх дабрадзействах і будзем здзяйсняць справы міласэрнасці. Ні пры якіх абставінах не будзем сумаваць і тужыць, а будзем крыніцай мірнага і набожнага духу для ўсіх, хто нас акружае.

Дарагія браты і сёстры! Віншуючы ўсіх вас з вялікім святам Раджжаства Хрыстовага і Навалеццем, малітоўна жадаю, каб вашы сэрцы напаўняліся светлай радасцю ў Госпадзе, Які нарадзіўся, каб мір і згода панавалі ў кожным доме, сям'і, ва ўсёй нашай Айчыне і за яе межамі. Добрага вам здароўя, дапамогі Божай ва ўсіх вашых справах, і няхай кожны дзень вашага жыцця будзе асветлены ззяннем Віфлеемскай зоркі.

**Веніямін,**
**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх**
**усяе Беларусі.**

# Пад сузор'ем Малой Мядзведзіцы

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сёння якіх тут толькі гурткоў па інтарэсах няма! Адны шыюць, другія вяжуць, трэція збіраюць з траў наборы лячэбнай гарбаты, чацвёртыя мыла вараць... Дачка бацюшкі Анастасія Блашко ўзяла абавязкі па каардынацыі дзейнасці цэнтра на сябе. А яшчэ вядзе ў школе № 1 факультатыўныя заняткі па прадметах «Асновы праваслаўнай культуры» і «Духоўнасць і патрыятызм». Яна — дыпламаваны тэолаг, закончыла БДУ.

Дарэчы, тэлескоп з'явіўся менавіта дзякуючы дзейнасці цэнтра. Бо тая прадукцыя, якая ствараецца ў яго сценах, часткова ідзе на продаж. «Сабралі грошы і купілі, — усміхаецца на маё здзіўленне святарнік. — Самі зарабілі. На продажы той жа гарбаты, мыла і сувеніраў. Круглянскім дзецям гэты тэлескоп патрэбны».

Тэлескоп у прыхадской маёмасці не адзін. Другі, па словах матушкі Алены Кажаноўскай, падарылі прыхаджане. «Ён яшчэ савецкі, працейшы ва ўжыванні, але Месяц і бліжэйшыя зоркі таксама нядрэнна наблізажае», — удакладняе яна.

З храмам круглянцы дзеляцца каштоўнымі рэчамі таму, што прыход і іх падтрымлівае. На сайце праваслаўнай абшчыны пазначаны тэлефон, па якім звяртацца, калі патрэбная матэрыяльная дапамога. Тут ужо стала традыцыяй дабрачынная акцыя «Калядны падарунак», калі храм дапамагае тым, хто трапіў у цяжкае становішча. Што датычыцца тэлескопа, на які царква таксама не пашкадавала грошай, то гэта прылада аказалася запатрабаванай ў маштабах горада. Такога няма ў школах раёна.

— У яго можна ўбачыць амаль усе нашы планеты, — кажа Анастасія. — Можам глядзець на каметы, сузор'і, зацьменні. Калі было сонечнае зацьменне, дзеці хвілін 40 глядзелі ў неба. Зарапад у жніўні амаль тыдзень быў, дзяўчынкі не давалі хлопцам падступіцца, усё жаданні загадвалі. Відовішча вельмі прыгожае. Калі падключыць камеру, можна здымаць. Некаторыя дзеці ўмудраюцца рабіць фота на тэлефон. Падносяць яго да вочка тэлескопа і здымаюць. Наогул, калі нешта цікавае адбываецца на небе, дзеці з настаўніцай прыходзяць і назіраюць. Калі трэба, дык і ноччу. У іх па школьнай праграме адно дзённае назіранне, другое — начное.

Летась заняткі праводзіліся па пятніцах на працягу дзвюх гадзін. Плюс — калі нейкія незвычайныя з'явы ў небе. Прыходзілі навучэнцы 1-й і 2-й гарадскіх школ, а таксама ўсе ахвотныя, у тым ліку дарослыя. Школьнікі складалі карты зорнага неба, вылічвалі, у якім месяцы сузор'е павінна быць у пэўны дзень. Сёлета ў графік работы гуртка прыйшлося ўнесці карэктывы, бо настаўніца больш загружана ў школе. Але калі на небе намячаецца якая-небудзь падзея, юныя астраномы зноў тут.

— Гэта планетарны тэлескоп, больш прызначаны для разгляду планет, — кажа **настаўніца фізікі Круглянскай сярэдняй школы № 1 Паліна ТРЫФАНАВА.** — Але ён сучасны, можна настроіцца на любую зорку па каардынатах. Школьны не дазваляе гэтага зрабіць. Магу аўтарытэтна пацвердзіць, што прыходскія тэлескопы лепшыя ў раёне. Таму і заняткі там адбываюцца. Два гады запар мы рэгулярна збіраліся ў духоўна-асветніцкім цэнтры і назіралі розныя цікавыя з'явы.

Па словах настаўніцы, лепш за ўсё ў тэлескоп бачны Месяц. І фота вельмі добрыя атрымліваюцца, супастаўныя з тымі, што ў падручніку. Дзеці самі выразалі фрагменты зорнага неба, рабілі карты і вучыліся з імі працаваць. Астраномію вывучаюць у 11-м класе, але на занятакі збіраліся сямікласнікі і нават вучні пятых класаў. І яны ўжо навучыліся працаваць па картах зорнага неба. Разам з настаўніцай шукалі праз тэлескоп зоркі, якія павінны быць бачныя ў гэтым паўшар'і днём, але не вельмі ўлоўныя, калі пра іх не ведаць. Ноччу, асабліва калі неба яснае, ад яго вачэй не адвесці. Тыя ж Касіяпея і Палярная зорка добра бачныя над храмам, а яшчэ сузор'е Малой Мядзведзіцы.

— Гурток запатрабаваны, мы абавязкова будзем і надалей працаваць, — абяцае настаўніца. — Летась стабільна займаліся па пятніцах. Цяпер у мяне вялікая нагрузка ў школах, і мы прыходзім сюды, калі ёсць нагода. Дзеці ўвесь час просяць: давайце ўжо збяромся! Пасля заняткаў мы чай у трапезнай пілі, было вельмі ўтульна. Дзецям падабаецца. Таму, хоць і радзей, але назіранні за зорным небам працягваюцца.

Пакуль нечага надзвычайнага ў небе назіраць не даводзілася. Але падлеткі ў захапленні ад зацьмення-пераменных зорак, яны мяняюць бляск і мільгаюць. Быццам іншаземныя цывілізацыі перадаюць прывітанне. Школьнікі самастойна штудзіравалі крыніцы інфармацыі, каб даведацца, чаму такое адбываецца.

Настаўніца сведчыць: круглянскія дзеці любяць астраномію і перамагаюць у раённых алімпіядах, удзельнічаюць у рэспубліканскай гульні-конкурсе «Арыёнчык». І ў гэтым ёсць заслуга настаяцеля праваслаўнага прыхода.

У храме маюцца і іншыя цікавінккі. Напрыклад, дзіцячы аналой вышынёй 80 сантыметраў. Маладыя маці гэта вельмі ацэньваюць, бо не трэба падымаць дзіця, яно само дацягнецца, каб ушанаваць ікону. Дзіцячы аналой зрабіў начальнік Круглянскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Сяргей Шчытнікаў, за што яму ў храме вельмі ўдзячныя. Такога вы, хутчэй за ўсё, нідзе у краіне больш не ўбачыце. На дзіцячым аналоі ляжыць ікона «Благаславенне дзяцей», якую для храма напісаў вядомы магілёўскі мастак Аляксандр Росінаў.

А яшчэ ў Круглянскім Свята-Троіцкім храме ўкаранілі традыцыю, якую прывезлі з Брэстчыны, са Столінскага раёна — сваімі рукамі робяць вялікія, да двух метраў, свечкі. Толькі там — калядныя, а тут — велікодныя.

У духоўна-асветніцкім цэнтры 25 дзяцей наведваюць нядзельную школу, а дарослых прыходзіць у некалькі разоў болей. Дарэчы, калі дзеці праходзяць 10-гадовы курс праграмы па асновах духоўна-маральнай культуры, ім даецца спецыяльны дыплом. Падчас вучобы яны чытаюць на царкоўнаславянскай мове, даведваюцца пра асновы праваслаўнай веры. Дзяўчынкі навучаюцца шыць, вышываць, вязаць, хлопчыкі знаёмяцца з ваеннай гісторыяй, медыцынай, асновамі бяспечнай жыццядзейнасці. Ёсць невялікі харавы калектыў, які спявае на службах і ўдзельнічае ў фестывалях. А маршрут па памятных праваслаўных мясцінах Круглянчшыны, які распрацавалі для конкурсу «Маршрутамі памяці», заняў другое месца ў краіне.

А яшчэ тут стварылі тэатр ценяў. На Вялікдзень паказалі прэм'еру, яна ўсім спадабалася. На Каляды тэатр парадуе гледачоў гісторыяй «Нараджэнне Хрыстова». Падрыхтоўка праведзена грунтоўная: 12-гадовая Вара Белавус так спрытна кіруе кардоннымі фігурамі, што яны літаральна ажываюць у яе руках.

На Каляды любы зможа паназіраць за зорным небам. Нездарма вестку, што Хрыстос нарадзіўся, чалавецтва атрымала менавіта ад зор.

— Тая Віфлеемская зорка, якая калісьці вяла вешчуноў, дагэтуль таямніца для чалавецтва, — кажа Анастасія. — Было шмат спрэчак наконт таго, што гэта магло быць. Калі мы чытаем біблейскую гісторыю, складваецца ўражанне, што і пастухі, і вешчуны прыйшлі адначасова. Але з пункту гледжання гісторыі — гэта не так. Насамрэч пастухі прыйшлі адразу, а вешчуны прыкладна праз тры гады. За адну ноч яны не маглі дайсці. Тым больш што жылі не ў адным месцы. Калі яны ўбачылі на небе тую з'яву, зразумелі, што прадказанні збыліся, на зямлю прыйшоў Збавіцель.

Ёсць версія, што гэта была камета Галея, якая перыядычна вяртаецца да Сонца. Іншыя лічаць, што ў момант нараджэння Хрыста маглі быць бачныя планеты Сатурн, Юпітар, Марс, якія падобныя на буйныя зоркі. Яркае нябеснае цела было, але якое — людзі не ведаюць. Тады тэлескопаў не было. Космас — жывы, у ім усё рухаецца па сваёй траекторыі...

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**

*г. Круглае.*

## Надвор'е

# СТУДЗЕНЬ ПРАЦЯГВАЕ ЗДЗІЎЛЯЦЬ

**Рэзкае пахаладанне, моцны вецер і галалёдзіца прагназуюцца ў Беларусі з 6 да 11 студзеня, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

7 студзеня будзе пераважна без ападкаў. Уначы — ад мінус 3 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 20 градусаў па паўночным усходзе краіны, месцамі па Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях будзе мінус 21—25 градусаў. Днём чакаецца мінус 8—13 градусаў. Па паўночным усходзе — да мінус 16 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да 0 — мінус 7 градусаў.

У нядзелю, 8 студзеня, толькі ноччу месцамі па захадзе краіны прагназуецца невялікі кароткачасовы снег. Уначы ад мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 20 градусаў па паўночным усходзе краіны, месцамі па Магілёўскай і Віцебскай абласцях — да мінус 23 градусаў. Днём чакаецца мінус 5—12 градусаў. Па паўночным усходзе месцамі будзе да мінус 14 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — мінус 4 — плюс 2 градусы.

У панядзелак, 9 студзеня, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць ападкі (снег, мокры снег, днём па паўднёвым захадзе з дажджом). Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, мяцеліца, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах мінус 6—13 градусаў, па ўсходзе — мінус 14—19 градусаў. Днём чакаецца мінус 3—10 градусаў. Па паўднёвым захадзе ноччу чакаецца мінус 5 — плюс 2 градусы, днём — мінус 2 — плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдняга прагнозу метэаролагаў, у апошнія дні першай дэкады студзеня па краіне чакаецца вельмі ветранае надвор'е.

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні спецыяльнаму карэспандэнту газеты «Звязда» Капрыленцы Наталлі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# СВЯТА, ЯКОЕ ЗАПОМНІЦЦА

**У Палацы Незалежнасці праходзяць навагоднія ранішнікі для дзяцей.**

Спачатку нарада па сур'ёзных пытаннях у дарослых, пасля — навагоднее свята ў дзяцей. У першыя дні новага года Палац Незалежнасці жыве па насычаным і разнастайным графіку. У рабочай Рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праходзяць навагоднія ранішнікі для малых беларусаў і гасцей нашай краіны. Спецыяльна дзеля таго зала ўрачыстых цырымоній ператвараецца ў казачны гарадок з дэкаратыўнымі хаткамі. Тут юныя наведвальнікі Палаца сваімі рукамі могуць зрабіць навагодняй паштоўкі, свечкі, ёлачныя цацкі, маскі, а таксама аквагрым. Менавіта ў гэтыя святочныя дні тут пад адным дахам сустракаюцца дзяржаўныя асобы ў строгіх касцюмах і казачныя героі, вясёлыя птушкі і жывёлы. І ўсе адчуваюць сябе ўтульна.

А дзецям тут яшчэ і цікава. Артысты падрыхтавалі для іх яркае дынамічнае прадстаўленне. Гледачы становяцца студэнтамі «Акадэміі часу». Разам з персанажамі спектакля малыя перадольваюць розныя выпрабаванні, шукаюць украдзеныя гадзіны і хвіліны. Дзеці не толькі глядзяць цікавую казку, але і вучацца правільна выкарыстоўваць час — самы каштоўны рэсурс. Урок, атрыманы ў такіх умовах, яны наўрад ці забудуць.

У чацвер навагоднее мерапрыемства ў Палацы Незалежнасці наведалі 248 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі. Таксама запрошаны дзеці сяброў грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа з Расійскай Федэрацыі і Латвійскай Рэспублікі. «Вельмі весела. Падабаюцца майстар-класы і конкурсы, не чакалі такога. Яшчэ і смачна пакармілі. Мы першы раз у Мінску і прадчувалі, што будзе крута. Не памыліліся», — падзялілася ўражаннямі Сафія Фядотава са Смаленска.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

«Мы былі вельмі ўсхваляваныя, што наведаем Рэзідэнцыю Прэзідэнта. Для нас гэта навагодні цуд. Не кожнае дзіця можа тут пабываць, і мы вельмі рады, што ў нас з'явілася такая магчымасць», — дадала яе сяброўка Марыя Касьянава.

Незабыўныя ўражанні ад навагодняга свята ў Палацы Незалежнасці застаюцца і ў дарослых. Праўда, іх уражваюць шчырыя эмоцыі дзяцей. «Асабліва ўразіла дэлегацыя дзяцей з Горлаўкі. Яны былі вельмі ўдзячныя, для іх пабываць у такім прыгожым месцы, паглядзець прадстаўленне і атрымаць падарункі — вялікае шчасце. Усе дзеці ў захапленні. Сюды ж прыязджаюць розныя катэгорыі дзяцей: якія растуць без бацькоў, дзеці са шматдзетных сем'яў, пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў. І ўсе застаюцца ў эйфарыі», — расказаў **Аляксандр ІГНАТЧЫК, намеснік дырэктара Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка**.

Акрамя ўзнёслых уражанняў, у юных гасцей Палаца Незалежнасці застаюцца падарункі ад кіраўніка дзяржавы. Кожнаму ўручаюць стылізаваны заплечнік з цёплымі шапачкай і шалікам, цукеркамі і, па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі, з асаблівым дапаўненнем — мёдам і яблычным сокам з асабістага падвор'я Прэзідэнта Беларусі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Шануй сваё

# ВЯРТАННЕ СЭНСАЎ

**У нядзельных школах ужо чуюцца ўрачыстыя песнапенні, моладзь рыхтуе спектаклі, храмы ўпрыгожаны. Але Раство не абмяжоўваецца толькі службамі, святочнай вячэрай і падарункамі. Стагоддзямі складваліся праваслаўныя традыцыі сустрэчы гэтага свята свят. На жаль, у многіх сем'ях у мінулым стагоддзі з розных прычын яны перарываліся. Але многае было захавана менавіта дзякуючы царкве. Нават тая ж батлейка. Як паведаміла старшыня Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Вераніка СЯРДЗЮК, пры багаслоўскім інстытуце таксама была створана батлейка, напісаны дзясяткі сцэнарыяў для прадстаўленняў. Разглядаецца пытанне нарэшце таго, каб тэксты батлеечных спектакляў увайшлі ў курс па традыцыйнай культуры для дзяцей 5-6 класаў.**

## ЧАС ДЛЯ ДОБРЫХ СПРАЎ

Вераніка Уладзіміраўна традыцыямі святкавання праваслаўнага Раства ў Беларусі падзялілася падчас круглага стала, які прайшоў у Доме прэсы. Яна згадала і пра тры куцці, і пра беларускія калядкі «Учора звячора», «Дзіўная навіна», «Спі, мой міленькі сыночак», тэксты якіх прыдуманы менавіта беларусамі, а не перакладзеныя з іншых моў. Святочнымі зімовымі вечарамі рабілі не толькі кашу, але і ламанцы, сліўжыкі ды многія іншыя стравы. Гэтымі днямі ў сваім чаце матушкі з Беларусі дзеляцца рэцэптамі і расказваюць, як стараюцца захаваць іх у сваіх прыходах. Ёсць на Беларусі традыцыя «Па Калядзе», калі святар аб'язджае вёскі, у якіх няма бацюшкі. Тут варта згадаць пра «абедніцу», калі святар уначы можа служыць літургію ў адным храме, наступным днём ехаць у другі, трэці і такім чынам несці радасць Раства ва ўсе прыходы.

На беларускіх землях заўжды былі добрасуседскія зносіны паміж людзьмі. Некаторыя сем'і былі міжканфесіянальнымі, таму і Каляды тут маглі святкаваць два разы. Дарэчы, абход двароў з пажаданнямі дабрабыту і радасці ў нас ладзіўся не толькі на Каляды — з добрым пасылам вясёлыя гурты моладзі ішлі і на Вялікдзень.

Каляды — час для добрых спраў. Сёння людзі кажуць, што ў святочныя дні працаваць нельга, але ў народнай традыцыі ў такія дні дазвалялася нешта рабіць на карысць іншых, напрыклад, дапамагчы ўдовам і сіротам ці выкапаць калодзеж, якім усе змогуць карыстацца. Рабілі такія справы талакой. Культурная і сацыяльная праца — арганізацыя святочных мерапрыемстваў, спектакляў, абходы людзей, абдзеленых увагай, — з'яўляюцца добрым працягам народных дабрачынных традыцый.

На тое, што ў Раство нельга забывацца пра людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, звярнуў увагу і **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі протаіерэй Ігар КАРАСЦЯЛЁЎ.** У храмы можна прынесці падарункі, ахвяраванні, якія будуць перададзены сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян. У святочныя дні святары заўсёды стараюцца падтрымаць тых, каго апякаюць.

Вераніка Сярдзюк падзялілася, што ў цэнтр «Матуля» часта звяртаюцца па дапамогу жанчыны, якія трапілі ў складаную сітуацыю. Гэта могуць быць бежанкі, дзяўчаты-мусульманкі, якіх не прымаюць родныя з-за незапланаванай цяжарнасці, маладыя маці. Днямі, напрыклад, тут збіралі сродкі для немаўляці адной з такіх парадзіх.

## ПАСЛАННЕ ПРАЗ ТРАДЫЦЫІ

«Традыцыі дазваляюць аб'яднаць мінулае, сучаснасць і будучыню», — упэўнены **протаіерэй Андрэй ЕЎДАКІМАЎ, настаяцель храма святога Архангела Міхаіла ў горадзе Жодзіне**.

— Прамая прапаведзь, заклік да малітвы часта бянтэжыць сучасных людзей. Традыцыі святкавання даюць магчымасць праз цеплыню, абрады ў храме і дамах звярнуць увагу на самае галоўнае — сэнсавы змест свята Раства Хрыстова, на ўсю глыбіню хрысціянства.

Протаіерэй згадаў, што сярод яго сваякоў былі святары, якія служылі яшчэ да рэвалюцыі, а ў сям'і і ў наш час прынята ставіць калядную вячэру на сена. Дзякуючы гэтаму беларусам звычайна проста перадаць атмасферу свята. Так народ дадаваў у свой побыт сімвалы, якія нагадвалі пра нараджэнне Хрыста. Праз шматвяковыя традыцыі, уклад людзі перадавалі ідэі, веру, надзеі наступным пакаленням, што ўплывала на фарміраванне асобы. Сёння святары стараюцца данесці сэнс Раства нават па-за межамі храма. У прыходзе айца Андрэя прынята напярэдадні свята з размовамі наведваць школы і прадпрыемствы.

## НАРОДНАЯ ФІЛАСОФІЯ

Напрыканцы мінулага года традыцыя беларускага саломапляцення ўнесена ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Хочацца верыць, што гэта паспрыяе далейшаму развіццю залацістага рамяства. І беларусы пачнуць упрыгожваць да свята свае дамы не пластыкавымі цацкамі з кірмашоў, а саламянымі павукамі. Вядома, падобнае ўпрыгажэнне ў нашых продкаў мела і ўтылітарнае прызначэнне, паміж яго гранаў сапраўдныя павучкі рабілі павуцінне, у якое трапляла дакучлівая машкара. Але традыцыя вешаць на Каляды саламяных павукоў сведчыць і пра глыбокае ўсведамленне беларусамі падзей Раства: напрыклад, народныя паданні пра тое, як павук, каб ўратаваць святое сямейства, заплёў уваход у пячору. **Начальнік аддзела арганізацыі аховы і ўліку гістарычна-культурных каштоўнасцяў Міністэрства культуры Марыя НЕЦВЯТАЕВА** адзначыла, што ў беларусаў была традыцыя адмысловага ўпрыгожваць дом да посту. Перад святам ён зноў абнаўляўся, гаспадыні даставалі больш яскравыя посцілкі, багата расшытыя ручнікі. Менавіта ў такія ўпрыгожаныя дамы ішлі калядоўшчыкі... Часам у вёсках бытавалі адметныя рэгіянальныя традыцыі, некаторыя з іх нараджаліся і захоўваліся ў сем'ях. Традыцыі дапамагалі не толькі перадаваць святочны настрой — на іх трымаліся сувязі з родам, з зямлёй, дзе чалавек нараджаўся, традыцыі давалі адказы на многія пытанні, навучалі і з'яўляліся асаблівай засцярогай ад дрэнных думак, ад адзіноты.

Сёння ў Нацыянальным спісе 164 гісторыка-культурныя нематэрыяльныя каштоўнасці. Ён працягвае папаўняцца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**ЗДАНИЯ ДЕРЕВООБРАБОТКИ**

*(составные части и принадлежности: пристройка, забор железобетонный, подъездные дороги, опилкоприемник),*
**инв. № 601/С-26267, общей площадью 478,4 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,6437 га с кадастровым номером 623288000016000004**
*(право постоянного пользования)*
**по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, 8 в д. Жабичи.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **52 000,00 бел. руб.**
*Начальная цена снижена на 50 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **5 200,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа – OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 01.10.2022, 10.12.2022.

Аукцион состоится **24.01.2023 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.01.2023** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8044) 797-93-83.**

УНП 100104937



ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Лоевского РайПО (продавец) извещает о проведении **18 января 2023 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-290116 общей площадью 192,4 кв. м, наименование – магазин № 17, назначение – здание специализированное розничной торговли, расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100008000001 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Комсомольская, 16. Кондиционер, инв. № ЛО752. Кондиционер, инв. № ЛО10939. Котел стальной, инв. № ЛО10834. Холодильная камера, инв. № ЛО0000391 |
| **Начальная цена** продажи без НДС – **59 341,60** бел. руб. **Задаток 10 %** – 5 934,16 бел. руб. |

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Лоевского РайПО (продавец) извещает о проведении **18 января 2023 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-24859, площадью 392,5 кв. м (магазин № 8 «Хозтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли), расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100001003139 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Горького, 19 |
| Стеллажи металлические, инв. № 130 (21 шт.), котел отопительный, инв. № 136, козырек (козырек маг. 8), инв. № ЛО0000423 |
| Заключен договор аренды № б/н от 27.03.2019, срок действия до 31.12.2022 г. |
| **Начальная цена** продажи без НДС **– 129 247,50** бел. руб. **Задаток 10 % – 12 924,75** бел. руб. |
| **Лот № 2:** Капитальное строение с инв. № 340/С-25757, площадью 623 кв. м (магазин № 15, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: две пристройки, склад), расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100001000168 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Шевелева, 57А |
| Шкаф холодильный (15), инв. № ЛО677, холодильный шкаф, инв. № ЛО0000368, холодильный шкаф, инв. № ЛО0000396, горки, оборудование «Закуска», инв. № ЛО0000467, котел отопительный закусочная, инв. № ЛО0000457, стеллаж металлический, инв. № ЛО10843 (3 шт.), стеллаж деревянный, инв. № ЛО719 (4 шт.), столы – 5 шт., стулья – 15 шт., светильники – 2 шт. |
| Заключен договор аренды № 27 от 27.02.2019, срок действия до 30.09.2024 г., договор аренды № 1 от 01.07.2019, срок действия до 01.07.2024 г. |
| **Начальная цена** продажи без НДС – **194 737,50** бел. руб. **Задаток 10 % – 19 473,75** бел. руб. |

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Ленина, 26А.

Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17.01.2023 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителями, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

# МАЛІТВА ДЛЯ ДУШЫ

**Тэлеканал «Беларусь 3» пакажа трансляцыі святочных богаслужэнняў на Раство Хрыстова. А ў эфіры канала «Культура» глядзіце дакументальны фільм пра Валаам.**

Так, 6 студзеня ў 18.00 у прамым эфіры з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора будзе арганізавана цырымонія Усяночнага дбання. Апоўначы глядзіце Боскую літургію на Раство Хрыстова. Абедзве службы ўзначаліць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Па просьбе тэлегледачоў трансляцыі богаслужэнняў будуць суправаджаць сурдаперакладам. А раніцай 7 студзеня ў 08.20 у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» уладыка Веніямін звернецца да вернікаў са Словам на Раство Хрыстова.

Ноччу з пятніцы на суботу на канале «Культура» пакажуць дакументальны фільм «Паездка для душы. Хто ўпарты — таму на Валаам» (2023 г.). Работа рэжысёра Канстанціна Галенчыка знаёміць гледача з вандроўкай у святое месца журналіста Аляксандра Казакевіча, а таксама з гісторыяй Спаса-Праабражэнскага манастыра. Потым праграма «Лета Гасподняе» раскажа пра само свята Раства Хрыстова.

Сядзі і глядзі

# «УКЛЮЧАЙСЯ!» У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Напярэдадні доўгачаканых зімовых свят і Раства Хрыстова тэлеканал «Беларусь 2» парадаваў сваю аўдыторыю падарункамі. Сярод іх і тое, што цяпер любімыя маладзёжныя праекты «Уключайся!» і «ПІН_КОД» выходзяць у эфір з мадэрнізаванай тэлестудыі.**

Кожны будны дзень гледачы сямейнага тэлеканала распачынаюць у кампаніі вядучых Арцёма Сямёна і Жана Сянкевіча, Марыі Хрусталёвай і Германа Малышыцкага. Аглядзы музычных навінак і кінапрэм'ер, цёплыя сустрэчы з цікавымі гасцямі і толькі добрыя навіны, праверанае рэцэпты карысных сняданкаў ад шэф-кухараў і найлепшыя мультфільмы чакаюць кожнага ў эфіры з 6 да 10 раніцы. Акрамя гэтага, журналісты шоу «Уключайся!» не стамляюцца эксперыментаваць з напаўненнем кожнага выпуску і прапаноўваюць нам аўтарскія рубрыкі аб мастацтве і шэдэўрах са збору беларускіх музеяў, карысныя парады для аматараў жывёл і карыстальнікаў гаджэтаў.

І цяпер зарадка для розуму і вачэй праходзіць у яшчэ больш утульнай атмасферы, таму што дызайнеры прыўнеслі ў кадр пастэльныя тоны і свежыя візуальныя рашэнні, а ў якасці элементаў дэкарацый выкарысталі жывыя расліны. У выніку рабочая прастора студыі павялічылася, а значыць, стала больш шырокай і прастора для фантазій і крэатыўных ідэй каманды ранішняга шоу. Пры гэтым нязменным застаўся па-ранейшаму рэцэпт бадзёрай і вясёлай раніцы ад праекта «Уключайся!» на тэлеканале «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 182

